## Картка 2
## Асноўныя прыметы тэксту. Асаблівасці структуры тэкстаў розных тыпаў.
## Варыянт 1

**1.** *Адзначце той пункт, у якім сказы звязаны сэнсава і структурна, а іх змест раскрывае адну тэму.*

1. Ва ўсе часы чалавек імкнуўся ўвекавечыць імёны і справы не толькі герояў, але і сваіх родных, блізкіх. Жыхары Беларусі – народ не ваяўнічы. Што ж засталося ў нас? Пазіраюць у нашы спіны пранізлівыя вочы прашчураў з тысячагадовай бездані часу. Храм быў цэнтрам жыцця сярэдневяковага горада.

2. Скарбы нашай гісторыі незлічоныя. Шмат таямніц да часу хаваецца ад навукі. Тыя асобныя рэчы матэрыяльнай культуры, якія з'явіліся на свет дзякуючы намаганням старажытных майстроў, а праз стагоддзі – гісторыкаў і археолагаў, -- кропля ў моры. У Полацку, напрыклад, археалагічны збор вызначаецца сотнямі тысяч знаходак. Уявіце, якім неабсяжным было гэта мора! За рэчамі, нават празаічнымі, паўстаюць людзі і цэлыя эпохі. *(Паводле С.Тарасава)*

**2.** *Закончыце фармулёўку.*

Ланцуговую сувязь сказаў у тэксце дапамагаюць ажыццявіць ____________________________________________________________
____________________________________________________________.

**3.** *Запішыце асноўныя прыметы навуковага апісання.*

____________________________________________________________
____________________________________________________________
____________________________________________________________.

**4.** *Вызначце і запішыце стыль тэксту, сладзіце яго кампазіцыйную схему.*

Гэты дзень быў для хлопчыка надзвычай шчаслівы: удача напаткала на самым пачатку. Ніколі не зварочваў ён у дубняк, а сёння нібы нешта падштурхнула. Пятрок сышоў са шляху і вачам не паверыў: на травяным доле сядзелі вялікія і моцныя баравікі. А найбольш адарыла хлопчыка баравічкамі невялікая паляна. Амаль поўны кошык грыбоў назбіраў Пятрок! Горды і шчаслівы ад сваёй удачы прыйшоў дадому. *(Паводле І.Навуменкі)*

Стыль тэксту: ________________________________________

Кампазіцыйная схема:

---

**5.** *Прачытайце тэкст, знайдзіце сказ, які выражае асноўную думку тэксту. Запішыце гэты сказ па-беларуску.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мы часто повторяем, что наш язык велик и могуч. Однако при этом речь наша часто бывает бедна и невыразительна. Что же происходит? Почему мы не используем богатства родного языка и не заботимся о культуре речи? Очевидно, причиной тому наша леность, неумение выбрать из множества похожих слов самое нужное. Речевые ошибки – большое зло, с ним нужно бороться. Если мы постараемся, наша речь будет красивой и точной. *(По Д.Розенталю и И.Голубу)*

________________________________________________________________
____________________________________________________________________
________________________________________________________________.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Прозвішча, імя** **Адзнака**

**Картка 2**
**Варыянт 2**

**1.** *Адзначце той пункт, у якім сказы звязаны сэнсава і структурна, а іх змест раскрывае адну тэму.*

1. Лазеры – гэта квантавыя генератары аптычнага дыяпазону, ці прасцей – генератары святла. У аснову іх работы пакладзена з’ява ўзмацнення электрамагнітных хістанняў пры дапамозе вымушанага выпраменьвання атамаў і малекул. Само слова «лазер» азначае ўзмацненне святла. Гэту навуковую ідэю прадказаў яшчэ ў 1917 годзе выдатны фізік і філосаф Альберт Эйнштэйн. З таго часу, бадай, і пачынаецца гісторыя стварэння лазераў. *(М.Лібінтаў)*

2. Мы і не ўяўляем сёння, як гэта людзі абыходзіліся раней без шарыкавай ручкі. З Венгрыі Біро едзе ў прамысловыя краіны. Але як увасобіць у жыццё арыгінальную ідэю, як пачаць масавы выпуск зручных шарыкавых аўтаручак? Аказваецца, яшчэ ў 1888 годзе Лаўд атрымаў патэнт на маркёр для цюкоў і скрынь.

**2.** *Закончыце фармулёўку.*

Паралельную сувязь сказаў у тэксце дапамагаюць ажыццявіць ______________________________________________________________
____________________________________________________________.

**3.** *Запішыце асноўныя прыметы мастацкага апісання.*

______________________________________________________________
______________________________________________________________
____________________________________________________________.

**4.** *Вызначце і запішыце стыль тэксту, складзіце яго кампазіцыйную схему.*

У творы К.Чорнага слова *гаварун* успрымаецца адназначна: ‘той, хто гаворыць’. Але ў сучаснай літаратурнай мове гэтае слова замацавалася са значэннем ‘чалавек, які любіць пагаварыць’. Таму яно, відаць, і не заменіць калькі *гаворачы*. Якое ж тады слова можа падысці?

Згадаем аднакаранёвыя словы: прамаўляць – прамова – прамоўца. Затым пабудуем аналагічны рад: размаўляць – размова – размоўца. Так, апошняе слова дапускаецца беларускім словаўтварэннем і жыве ў літаратурнай мове. *(Паводле А.Каўруса)*

Стыль тэксту:______________________________________________
Кампазіцыйная схема: ________________________________________

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**5.** *Прачытайце тэкст, знайдзіце сказ, які выражае асноўную думку тэксту. Запішыце гэты сказ па-беларуску.*

Простое слово «здравствуйте» можно сказать приветливо, сухо, равнодушно, отрывисто, мрачно. Это простое слово можно произнести на тысячу разных ладов. А написать? Для этого понадобится на одно «здравствуйте» несколько слов комментария, как именно было произнесено это слово. Диапазон интонаций можно считать беспредельным. Истинный смысл сказанного заключается не в самих словах, а в интонациях. *(По И.Андроникову)*

________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

__________________________ ____________

**Прозвішча, імя** **Адзнака**